**“Падпольны і партызанскі друк Беларусі” (2008–2010 гг.)**

Праект прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён рэалізаваны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў супрацоўніцтве з Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры падтрымцы ЮНЕСКА. Праект прадугледжваў адбор, навуковае апісанне і аблічбоўку газет, улётак, рукапісных часопісаў, насценгазет з фондаў дадзеных устаноў (большасць у адзіным экзэмпляры, многія не ўлічаны ў бібліяграфіі) і стварэнне мультымедыйнага DVD-Rom. Электроннае выданне “Падпольны і партызанскі друк Беларусі” ўключае ў сябе каля 100 найменняў электронных копій улётак, больш за 120 найменняў газет, газет-плакатаў, рукапісных дакументаў, створаных падпольшчыкамі і партызанамі. Гэты праект дазволіў зрабіць здабыткам шырокай грамадскасці каштоўныя калекцыі друкаваных матэрыялаў беларускіх падпольшчыкаў і партызан.